Весткі й Паведамленьні

інфармацыйны бюлетэнь Згуртаваньня “ПАГОНЯ”

Viestki j Paviedamleńni

Сусьветнае сеціва: e-krama.com, pahonia.com
Электронны адрас: viestki@mail.com
✉ P. O. Box 3225, Farmingdale, NY 11735

№ 9 (595)
Верасень 2015 г.

Як вядома, карнавал ёсьць часткаю традыцыйнага рэлігійнага цыклю ў шмат якіх хрысьціянскіх краінах (у беларусаў – Масьленіца, Масьленка), а паходзіць ад антычных бакханаліяў. Гэта некалькі дзён сваволі, весялосьці, а таксама перакуленьня звычайнага ходу жыцьця, калі йдуць дагары нагамі прынятыя гіерархіі й сэнсы. Гэта нагода выпусьціць пару, псыхалягічна зьняць назапашаную за год напругу. А пасьля гэтага наступае Вялікі пост, і ўсё вяртаецца на звычайныя рэйкі.

Нажаль, у Заходнім, або Вольным, сьвеце карнавал, які пачаўся спакваля некалькі дзесяцігодзьдзяў таму, замест каб спыніцца – апаноўвае ўсё новыя і новыя сэгмэнты жыцьця, прычым ня толькі грамадзкага. І прыдумалі гэтае дзівоцьце не царкоўнікі й манахі, але Але тут гаворка не аб белай расе. Наадварот, кожны белы чалавек, на думку псэўдалібэралаў, носіць у сабе “першародны грэх”. Гэты грэх завецца “белая прывілегіяванасьць”, і ён вісіць на ўсіх, ад белых амэрыканскіх немаўлятаў да старых імігрантаў, бо ўжо адным сваім існаваньнем яны, нібыта, панявольваюць і згаршаюць цемнаскурыя мяншыні. Расізмам лічыцца нават сказаць: “Кожнае жыцьцё – каштоўнасьць”, у адказ на шумную і агрэсіўную кампанію чорных расістаў і левакоў “Чорнае жыцьцё – каштоўнасьць”.

Прэзыдэнт ЗША выбачаецца за моц і ўплыў сваёй краіны. Парушальнікі яе межаў не караюцца, але наадварот, узнагароджваюцца. Для іх ствараюцца адмысловыя ільготы, цэлыя гарады аб’яўляюць сябе прытулкам нелагалаў, дзе не працуюць фэдэральныя правы гультаяваць! Непрацоўе – зброя пралетара! Хай нас, 99%, забясьпечваюць капіталістычныя багатыры!”

Адказам на пагаршэньне міжнароднай сытуацыі, узмацненьне Ісламскай дзяржавы на Блізкім Усходзе, агрэсію Пуціна ва Ўкраіне, гегемонію Кітая ў Паўднёва-Ўсходняй Азіі – стала скарачэньне амэрыканскага войска і зьмяншэньне вайсковых выдаткаў. Цяпер асноўнай задачай войска ёсьць забесьпячэньне правоў жаўнераў-гамасэксуалістаў і вырашэньне пытаньня аб прыняцьці ў войска трансгендарных асобаў. Асноўная задача флёту – забесьпячэньне марской экалёгіі й стварэньне эфэктыўных відаў біяпалива. Вайры ня маюць доступу да зброі на сваіх вайсковых базах – што можа лепей сымбалізаваць карнавалізацыю ўзброеных сілаў.



псэўдалібэральныя ідыёлягі й актывісты. Зірнем на ЗША. Пасьля фантастычных абвінавачаньняў паліцыі ў злачынствах, якіх яна не рабіла, і рабункавых фэстаў у Фэргюсане й Балтыморы – паліцаі баяцца чапаць парушальнікаў. Цяпер не злачынцы ўцякаюць ад паліцыі, але наадварот – і гэта відавочная карнавалізацыя праваахоўнай сыстэмы. Цікавым інструмэнтам карнавалізацыі ёсьць абвінавачаньні ў расізме. Калі злодзей, карумпаваны чыноўнік, несумленны палітык або нават слабы мастак ці пісьменьнік трапляюць пад крытыку – крытыкі адразу робяцца “расістамі” незалежна ад таго, ці мае рацыю тая крытыка. Галоўнае – мець “прывілегіяваную” расавую прыналежнасьць. коны. І гэта не прыцягвае ўвагі Вярхоўнага суду. Напэўна, маўчаньне судзьдзяў – знак таго, што так і трэба, што ўсё ў парадку. Парушэньне нармальнасьці становіцца новай нормай – узгадаем легалізацыю празь Вярхоўны суд аднаполых шлюбаў.

“Няроўнасьць прыбыткаў” абвяшчацца найвастрэйшай і найпякучай праблемай сьвету, прычым ходзіць зусім не пра Гаіці або Банглядэш. Псэўдалібэралы й левакі аплёўваюць капіталізм, не саромеючыся карыстацца ягонымі салодкімі пладамі, і не сьпяшаючыся перасяліцца ў сацыялістычныя Вэнэсуэлу ці Віетнам. Абавязку працаваць, каб забясьпечваць сябе і сям’ю, абвяшчаецца анатэма. “Чалавек мае

Адмысловыя фээрычныя падзеі разгортваюцца ў сфэры зьнешняй палітыкі. Іранскаму тэакратычнаму рэжыму, што адказны за сотні страчаных амэрыканскіх жыцьцяў у Іраку, Ліване, Саўдаўскай Аравіі, Абама пішчом імкнецца ўсадзіць у рукі атамовую зброю. Ізраіль, адзіны аліянт і адзіная сапраўдная дэмакратыя ў тым рэгіёне – дэманізуецца і абвяшчецца “дзяржавай апартэіду”. Па сьвеце ісламісты рэжуць хрысьціянаў і зьнішчаюць храмы, але заходнія ўрады пераняты больш важнай праблемай – “ісламафобіяй”! Расея вядзе агрэсію ва Ўкраіне, але замест падтрымкі Ўкраіны зброяй, тая атрымлівае натацыі пра тое, што нельга, бач ты,

заканчэньне на бачыне 3

Жнівеньскі сход Згуртаваньня “Пагоня”

У суботу, 8 жніўня 2015 году ў Цэнтральным парку ля возера і Бэтэсда-фантану прайшоў чарговы, жнівеньскі, сход Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня”. Напачатку сходу старшыня Згуртаваньня сп. Віталь Зайка прывітаў усіх, хто змог прыйсьці на імпрэзу, нягледзячы на тое, што суботняя раніца незаўжды спрыяе раньняму пад’ёму.

Далей у сваім выступе сп. Зайка спыніўся на прайшоўшым у мінулым месяцы Маршы Паняволеных Народаў, што традыцыйна арганізуецца Камітэтам Паняволеных Народаў. Прамоўца распавёў пра гісторыю створанай у 1959 годзе арганізацыі, мэтаю якой стала барацьба супраць расейскага камунізму, што паняволіў Усходнюю Эўропу, і традыцыю правядзеньня Тыдня Паняволеных Народаў у трэці тыдзень месяца ліпеня. Таксама сп. В. Зайка адзначыў, што цяпер беларусы складаюць абсалютную большасьць удзельнікаў мерапрыемстваў Тыдня, і таму варта было б падумаць пра тое, каб адрадзіць у больш актыўным фармаце працу Камітэту Паняволеных Народаў, абраць дзейную ўправу з прадстаўнікоў беларускай моладзі, якія пажадалі б заняцца грамадзкай працай. Затым можна было б сфармуляваць мэты на бягучы пэрыяд і складаць пляны, найперш па аднаўленьні кантактаў з амэрыканскімі ўладамі – Кангрэсам, прэзыдэнцкай адміністрацыяй і Дзярждэпартамэнтам.

Сп. Зайка нагадаў пра тое, як у 2003 годзе беларускія арганізацыі, а найперш Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне, Нью-Ёрскім аддзелам якога некалі зьяўлялася “Пагоня”, супольнымі высілкамі праводзілі лябіяваньне “Акту аб дэмакратыі ў Беларусі” – закону, што ўводзіў санкцыі супраць пэўных асобаў з адміністрацыі Лукашэнкі ды зьвязаных зь ім беларускіх кампаніяў. Эканамічны ціск аказаўся выніковым у справе вызваленьня тагачасных палітзьняволеных і стрымліваньня рэпрэсіяў рэжыму Лукашэнкі супраць апазыцыі. Аднак зь цягам часу беларускія ўлады навучыліся абходзіць пагрозы санкцыяў і досыць пасьпяхова маніпуляваць уласным ціскам на супрацоўнікаў амэрыканскай амбасады ў Менску, зьвёўшы колькасьць іх да ўсяго некалькіх чалавек. Найбольш выніковымі былі б санкцыі Эўразьвязу, але выглядае, што для яго лукашэнскі рээкспарт энэрганосьбітаў з Расеі зрабіўся занадта спакушальнай справай.

У кожным разе, менавіта эканамічныя санкцыі адчуваюцца наймацней, і менавіта іх варта было б скарыстаць больш пасьлядоўна і стасавана. І як раз для лябіяваньня такіх мераў і варта адрадзіць працу Камітэту Паняволеных Народаў, прыцягнуўшы, па мажлівасьці, прадстаўнікоў іншых усходнеэўрапэйскіх арганізацыяў у Амэрыцы, найперш украінцаў, балтаў, палякаў і грузінаў. Менавіта іхныя краіны апынуліся, у сьвятле апошніх падзеяў ва Ўкраіне, пад пагрозаю аднаўленьня расейскай дамінацыі, а нават і акупацыі. Прамоўца заклікаў жадаючых азваца, як маюць ахвоту далучыцца да гэтага праекту.

Затым сп. Віталь Зайка распавёў пра бягучыя пляны і працу Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня”, пра наступны сход, таксама ў Цэнтральным парку, у верасьні. Верасьнёўскі сход перанесены са звычайнай другой суботы месяца на трэцюю.

У разьдзеле “Рознае” па парадку дня адбылося знаёмства зь людзямі, што першы раз прыйшлі на сход “Пагоні”, і затым усе прысутныя прадставіліся і коратка распавялі пра сябе, свае пляны. Пасьля афіцыйнай часткі адбылося нязмушанае калегаваньне прысутных, што было прысьвечанае абмену інфармацыяй пра пошук працы і пэрспэктывы працы, у прыватнасьці, у галіне разьвіцьця сеціўных сайтаў і фінансавых сэрвісаў. Сустрэча атрымалася цікавай і карыснай.

Віталь ЗАЙКА



Фатаздымак Віталя Зайкі

Эмігрант Францыск Скарына, ці Апалёгія Лявона Юрэвіча

Юрэвіч, Лявон. Эмігрант Францыск Скарына, ці Апалогія. Мінск: Кнігазбор, 2015. — 624 с. — (Бібліятэка Бацькаўшчыны: кн. 25).

Сёлета айчынныя навукоўцы адзначаюць умоўны юбілей – 525 гадоў ад нараджэньня Францыска Скарыны. Гэтай даце прымеркаваная і новая кніга беларускага архівіста зь Нью-Ёрку Лявона Юрэвіча.

Францыска Скарыну можна лічыць знакавай постацьцю для беларускіх эмігрантаў ў розных аспэктах. Асоба "першага эмігранта" ўспрымалася суродзічамі па-за мэтраполіяй з асаблівай цеплынёй праз усьведамленьне агульнасьці выгнаньніцкага лёсу і пэўнай уласнай місійнасьці ў служэньні Бацькаўшчыне. Нездарма імя Скарыны стала бадай самым папулярным у назвах эміграцыйных суполак і арганізацый, а яго знакі і партрэты выкарыстоўваліся і публікаваліся ці не найбольш з усіх беларускіх гістарычных дзеячаў.



Постаць Францыска Скарыны зьвяртала на сябе асаблівую ўвагу эміграцыйных навукоўцаў сваім выразным "рэпрэзэнтацыйным" патэнцыялам. Асоба, што выдала першую кнігу ва Ўсходняй Эўропе, зрабіла адзін зь першых перакладаў Бібліі на эўрапейскую мову, не магла не выклікаць павагі (а часам і зайздрасьці, і спробаў прысабечыць першадрукара) з боку суседзяў. Скарынам беларусы на Захадзе адкрыта ганарыліся, ягоныя дасягненьні не выклікалі ні пытаньняў, ні пярэчаньняў. Папулярызуючы першадрукара эміграцыйныя навукоўцы і грамадзкія дзеячы выконвалі тое ж заданьне "паставіць Беларусь на сусьветную мапу", засьведчыць эўрапейскасьць беларускай культуры, нацыянальную адметнасьць беларусаў.

Разнастайная рэпрэзэнтаванасьць Францыска Скарыны і ягонай справы ў асяродзьдзі беларускіх эмігрантаў XX ст. і складае асноўны зьмест кнігі Лявона Юрэвіча. У першым разьдзеле – "Пачаткі скарынаведы на эміграцыі" – прадстаўленыя першыя спробы асэнсаваньня асобы і спадчыны першадрукара, зробленыя яшчэ ў міжваенны час Вацлавам Ластоўскім, Пётрам Крэчэўскім, Тамашам Грыбам. Далей у кнізе зьмяшчаецца інфармацыя пра некаторыя значныя пэрыёдыкі з паваеннай Нямеччыны і прысьвечаныя Францыску Скарыну тэксты зь іх.

Вялікая трэцяя частка кнігі "Імя Скарыны ў дзейнасьці эміграцыйных арганізацый" засяроджаная найбольш на пачатках Беларускага Інстытута Навукі й Мастацтва ды скарынаведных дасьледаваньнях доўгачасовага ягонага старшыні Вітаўта Тумаша. Зьмястоўнае ліставаньне апошняга складае адну з найцікавейшых частак выданьня. Акрамя БІНіМу, у разьдзеле прадстаўленая таксама Бібліятэка імя Ф. Скарыны ды адзін з скарыназнаўчых тэкстаў а. Аляксандра Надсана.

У наступнай частцы кнігі Лявон Юрэвіч сабраў тэксты, прысьвечаныя своеасабліваму працягу Скарынавай справы на эміграцыі. Тут можна прачытаць пра календарыстыку, беларускія маркі й кружэлкі на Захадзе, унікальныя кнігарукапісы Міколы Панькова, самавыдавецкія выданьні, асобныя аспэкты творчасьці Янкі Юхнаўца, а. Язэпа Германовіча і іншае.

Вядома, што дзякуючы разнастайнасьці сваёй дзейнасьці Францыск Скарына быў блізкім і выдаўцам, і кнiганошам, і лекарам, і перакладнікам, і падарожнікам, і чытачам. Зь піетэтам ставіліся да ягонай асобы сьвецкія і духоўныя... Усіх, хто займаўся і займаецца кніжнай справай можна лічыць пасьлядоўнікамі Скарыны. Галярэя іх вобразаў і тэкстаў склала асобную пятую частку кнігі Лявона Юрэвіча.

Чытачу прадстаўленыя малаведамыя факты пра перакладніка Яна Пятроўскага, філятэліста Расьціслава Палчанінава, бібліятэкараў: Васіля Шчэцьку, Лява Акіншэвіча ды Аляксандра Ружанцова, аўтараў і выдаўцоў: Вацлава Пануцэвіча, Часлава Будзьку, Пётру Палягошку, Кастуся Якуба-Птаха, Аляксандра Орсу, Міколу Гарошку, мастакоў: Міхася Саўку-Міхальскага ды Міколу Казака, нямецкага беларусіста Норбэрта Рандава.

Самога аўтара-ўкладальніка кнігі, што сьвяткуе сёлета 50-гадовы юбілей, таксама можна назваць Скарынавым пасьлядоўнікам. Асобны апошні разьдзел кнігі "Post scriptum: дзеці БССР" прысьвечаныя ягоным уласным досьледным пачаткам, асобам Язэпа Дылы, Рыгора Родчанкі, а таксама маці – Алене Юрэвіч.

У прадмове зазначана, што кніга прысьвячаецца памяці айца Аляксандра Надсана, што сёлета адышоў. Сам айцец – скарыназнаўца, кніжнік, захавальнік бібліятэкі, перакладнік богаслужбовых тэкстаў – важны для аўтара ня толькі як пасьлядоўнік Скарыны, але й як духоўны аўтарытэт, старэйшы сябра, які даваў падтрымку ў архіўна-досьледнай працы.

Кніга Лявона Юрэвіча стала юбілейнай і для сэрыі "Бібліятэка Бацькаўшчыны". Можна яе лічыць і своеасаблівым першым крокам у падрыхтоўцы да 500-годзьдзя беларускага кнігадрукаваньня, што будзе адзначацца ў 2017 годзе.

Натальля ГАРДЗІЕНКА

Бясконцы карнавал

заканчэньне з бачыны 1

"правакаваць Расею", бо тая "пачне сапраўдную вайну". Падтрымка дэмакратычных рухаў у сьвеце фактычна спынілася. Брутальныя рэжымы, напрыклад, Кіма ў Паўночнай Карэі, або Мугабэ ў Зымбабвэ не крытыкуюцца, бо інакш гэта было б "расізмам". Урад Абамы блякуе набыцьцё блізкай канадыйскай нафты, але ня супраць, каб вазіць нафту з-за мора.

Вайна супраць лёгікі й здаровага сэнсу, супраць нацыянальных інтарэсаў Амэрыкі й Вольнага сьвету, набірае моцы. Карнавал робіцца пэрманэнтным. Мэта яго – стварэньне "прагрэсіўнага", "правільнага" сьвету, у якім ня будзе "няправільных" зьяваў, паглядаў, сацыяльных групаў і структураў, партыяў, сьветапогляду і г.д. Нікому з "прагрэсараў" чамусьці ня прыходзіць у галаву, што адна такая спроба папраўіць і зраўняць сьвет, ужо каштавала чалавецтву ў 20-м стагодзьдзі блізу 100 мільёнаў загінуўшых людзей. І што пасьля цяперашняга карнавалу абавязкова прыйдзе Вялікі пост новага таталітарызму, новыя "цёмныя стагодзьдзі", вяртаньне ў сярэднявечча, а можа і ў рабаўладаньне.

Віталь ЗАЙКА

Пікнік у Праспэкт парку ў Брукліне


Фатаздымак К. Пратасені

Свой маленькі аповед пра наш беларускі пікнік у нядзелю 16 жніўня пішу з намерам зацікавіць землякоў зьбірацца разам, а таксама на зайздрасьць тым, хто паленаваўся прыйсьці.

Па-першае, пікнік атрымаўся сяброўскім, вясёлым і смачным. Па-другое, нам пашанцавала зь месцам, ад самага пекла мы схаваліся пад раскідзістым дрэвам. Па-трэцяе, надвор'е, можна лічыць, было таксама цудоўнае. Спачатку падпякала, а пасьля нечаканы дожджык усіх абмыў і астудзіў.

Увогуле нас сабралася няшмат, але і нямала, а ўсё ж такі 20 чалавек. Спачатку саромеліся, пакуль пазнаёміліся, бо пераважная большасьць да гэтай сустрэчы не былі знаёмыя між сабою, а пасьля ўжо актыўна пачалі смажыць каўбаскі, гуляць у мяч, распавядаць гісторыі з амэрыканскага жыцьця, хто і што пасьпеў ужо ўбачыць, абмяркоўвалі пляны на будучыя сустрэчы.

Водгукі аб сустрэчы былі пазытыўныя, што прыемна было пачуць.

Каця: Добра, што сабраліся, а то я лічыла, што толькі расейцы ды ўкраінцы зьбіраюцца. А тут вось і беларусы актыўныя ёсьць. Прыемна быць у сваёй суполцы.

Аляксандар: Люблю зьбірацца разам зь землякамі, адчуваю сябе як дома. Увогуле, такія сустрэчы нясуць новыя знаёмствы, новыя ідэі, ёсьць магчымасьць пацікавіцца ўсялякімі хітрасьцямі амэрыканскага жыцьця, са сваімі людзьмі неяк лягчэй ідзе размова.

Алена: Так смачна есьці смажаныя на прыродзе каўбаскі, дома такое не захочаш гатаваць, а тут у добрай кампаніі ды на сьвежым паветры – цудоўна.

Неспадзеўкаю дня была моцная залева, што засьпела нас зьнянацку, і мы вымаклі з галавы да пят. Але гэта ўсё суправаджалася жартамі і сьмехам. Нават зрабілі вынік, што пасьля гэтага моцна-трапічнага дажджу мы сталі сябрамі "не разьлі вада". Пасьля мы выціснулі ваду з адзежы, прасушылі наш сьцяг і прадоўжылі пікнік. Стравы былі інтэрнацыянальныя. Смажылі і ўкраінскае сала, і польскія кабаноскі, і амэрыканскія хат-догі. Калі сала аддаць украінцам, то зь беларускіх прадуктаў мы мелі толькі гомельскія вафлі "Спартак".

Праўду кажучы, на маю абвестку адгукнулася больш людзей, але ў апошнюю хвіліну шмат у каго пляны зьмяніліся. У любым выпадку, і так было вельмі прыемна бачыць, што людзі пераадолелі адлегласьць у 2-3 гадзіны, каб сустрэцца з землякамі. Дзякуем нашым сябрам зь Пэнсільвэніі, што знайшлі час і жаданьне раніцай у нядзелю прыехаць да нас.

Асаблівая падзяка Марату Клакоцкаму за ягоную ідэю і значную дапамогу ў арганізацыі імпрэзы. Дзякуем Кацярыне Пратасені за фатаздымкі. Я асабіста дзякую кожнаму, хто змог прыйсьці і прыехаць. Прыемна, што людзі адгукаюцца і радыя зьбірацца разам проста так, без усялякай прычыны. Спадзяюся, што наступны раз нас будзе больш. Далучайцеся!

Ганна ШАРКО

Уплаты ў Згуртаваньне Ñêëàäê³ é àõâÿðàâàíí³:

Д. Харытончык 60

Усім шчыры дзякуй!

Уплаты ў аддзел шліце на адрас:

P. O. Box 572
New York, NY 10113

Чэкі выпісвайце на імя *Viktar Yedzinovich.*

Шаноўныя сябры!

*Калі ласка, сваечасова абнаўляйце падпіску на наш бюлетэнь і аплочвайце сяброўскія складкі. (**гл. інфармацыю аб стане падпіскі на "Весткі й Паведамленьні" на канвэрце справа ад прозьвішча**).*

Наступны сход

Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня "ПАГОНЯ"

адбудзецца ў суботу **19-га верасьня 2015 году** на прыродзе ў Цэнтральным парку на Мангэтане.

Збор а **10.30** раніцы пры ўваходзе ў парк на скрыжаваньні ***5-й авэню*** і ***72-й вуліцы***.

Сход пройдзе на паляне ля возера (*The Lake with Boating*). Паляна знаходзіцца на поўнач ад *Terrace Drive* і на захад ад *The Mall at Bethesda Fountain.*

----

*Аб месцы і часе правядзеньня сходаў ды іншых імпрэзаў,ладжаных арганізацыяй, можна даведацца, наведаўшы ў інтэрнэце ўэбстаронку **pahonia.com***

Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні*:

Т. Асташка 30
Н. Бабко 30
В. Козырава 30
Г. Мураўёва 30
Т. Саланко 30
Д. Харытончык 30
М. Цітова 30
М. Данілюк 10

Шчыры дзякуй!

*Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы аплату гадавой падпіскі (**$30**) на адрас:*

Marat Klakotski
P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735

*Чэкі з адзнакаю **"Весткі"** выпісвайце на імя скарбніка Згуртаваньня "Пагоня" **Viktar Yedzinovich**.*